Смачнае месца




## Пытальнік

# На якія льготы маюць права інваліды II групы?

**Паважаная рэдакцыя! Прабачце, што задаю так шмат пытанняў, але мне неабходна ведаць на іх адказы. Я інвалід II групы па слыху і па агульным захворванні. Як мне ў далейшым давядзецца плаціць за кватэру, калі я жыву адзін і ў мяне раней была льгота па аплаце ў памеры 50 працэнтаў? Не так часта, але карыстаюся аўтобусам «Навагрудак—Магілёў» (да Бялынічаў, бо я там прапісаны). Ці захавалася льгота па аплаце за білет у памеры 50 працэнтаў? Тое ж датычыцца і чыгуначнага транспарту.**

**Я.У. ПАРФЯНОВІЧ**, *г. Навагрудак.*

На нашай просьбе ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Бялыніцкага райвыканкама падрыхтавала на гэты запыт падрабязны адказ.

«У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2007 года «Аб дзяржаўных сацыяльных льготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян» інваліды II групы маюць права на наступныя льготы:

— права на 90-працэнтную скідку з кошту лекавых сродкаў, якія выдаюцца па рэцэптах урачоў у межах пераліку асноўных лекавых сродкаў — у парадку, што вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь;

— права на бясплатны выраб і рамонт зубных пратэзаў (за выключэннем пратэзаў з каштоўных металаў, металакерамікі і фарфору) у дзяржаўных арганізацыях па месцы жыхарства і права на бясплатнае забеспячэнне іншымі тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі ў адпаведнасці з Дзяржаўным рэестрам тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі — у парадку, што вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь;

— права на бясплатны праезд на ўсіх відах гарадскога пасажырскага транспарту (акрамя таксі), незалежна ад месца жыхарства, а пражываючым у сельскай мясцовасці — таксама на аўтамабільным транспарце агульнага карыстання рэгулярных міжгародніх зносінаў у межах адміністрацыйнага раёна па месцы жыхарства;

— права на бясплатны праезд на чыгуначным, водным і аўтамабільным пасажырскім транспарце агульнага карыстання рэгулярных прыгарадных зносінаў (акрамя таксі).

Адначасова паведамляем, што права на 50-працэнтную скідку за тэхнічнае абслугоўванне і (або) карыстанне жылым памяшканнем у межах 20 квадратных метраў агульнай плошчы займаемага жылога памяшкання і 50-працэнтную скідку на аплату за камунальныя паслугі маюць інваліды I і II груп, якія не маюць працаздольных членаў сям'і, абавязаных па закону іх утрымліваць, і пражываюць адны ці толькі з інвалідам I ці II груп і (або) з непрацоўнымі пенсіянерамі, якія дасягнулі ўзросту, што дае права на пенсію па ўзросце на агульных падставах».

# Загінуў у 21 год пры абароне Магілёва

**Старшакласнікі і настаўнікі Кадзінскай школы знайшлі і запрасілі ў Магілёў сваякоў абаронцы горада, які загінуў у 1941 годзе.**



Любоў Андрэеўна і Іван Аляксандравіч Фраловы дабіраліся з Барнаула ў Магілёў амаль пяць дзён. Але часу і высілкаў ім зусім не шкада: Фралоў разам з сям'ёй шмат гадоў шукаў звесткі пра брата, які да гэтага часу лічыўся зніклым на вайне.

Барыс Аўчыннікаў нарадзіўся ў сяле Лябяжына Алтайскага краю. Ён закончыў школу, працаваў на трактарнай станцыі, а ў 18 гадоў пайшоў у армію. Неўзабаве пачалася вайна і ён даслаў родным апошнюю вестку: маўляў, адраса ў мяне няма, самі бачыце што здарылася, якімі будзем — пабачымся. І на гэтым усё.

Ужо ў 2004 годзе пошукавая экспедыцыя знайшла ў Магілёўскім раёне, на лініі абароны горада астанкі чатырох салдат. Іх пахавалі ў склепе пад капліцай на мемарыяльным комплексе «Буйніцкае поле».

У аднаго з салдатаў захаваўся медальён: акрамя звычайных звестак, там была прыпіска — калі што здарыцца, шукайце Фралова. Гэта быў айчым Барыса. Яго роднага бацьку ў час грамадзянскай вайны расстралялі калчакаўцы як савецкага камандзіра.

Атрад «Пошук» 9 «А» класа Кадзінскай школы расшукаў па прозвішчы Фралоў брата абаронцы Магілёва. Нягледзячы на тое, што Івану Аляксандравічу, які таксама ветэран вайны, ідзе 85-ы год, ён усё ж вырашыўся на падарожжа.

— Калі мне паведамілі пра брата, я спачатку не паверыў, — расказвае стары. — Плакаў. Але адразу лягчэй стала, бо наша маці дажыла да 90 гадоў і да апошняга свайго дня не знаходзіла спакою з-за Барыса. Мы разам з жонкай сёння пабывалі на месцы, дзе ён загінуў. Адвязём дадому сімвалічную жменьку зямлі.

На Буйніцкім полі, дзе пахаваныя абаронцы, Фраловы запалілі свечкі і ўсклалі кветкі. Сваякам перадалі асабістыя рэчы салдата: кацялок, скрутак з насавой хустачкі з манетамі (папяровыя купюры сатлелі) ды абойма з патронамі. Усё гэта будзе перададзена ў Лябяжынскі музей на радзіме Барыса Аўчыннікава.

**Ілона ІВАНОВА.**

### ТЭЛЕФОННАЯ КАНТРАБАНДА

На аўтамагістралі Брэст—Мінск каля Баранавіч супрацоўнікі КДБ і міліцыі тармазнулі мікрааўтобус, у якім аказалася 250 тэлефонных апаратаў без дакументаў. Высветлілася, што апараты агульным коштам 60 тысяч долараў былі завезены на тэрыторыю краіны кантрабандным шляхам.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### АДКУСІЎ... НОС

**Следчым аддзелам папярэдняга расследавання Ленінскага РУУС узбуджана крымінальная справа па артыкулу 147 КК — «Наўмыснае нанясенне цяжкага цялеснага пашкоджання» ў дачыненні да 42-гадовага мінчаніна, які адкусіў кончык носа ў свайго брата.**

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» прэс-афіцэр Ленінскага РУУС Святлана Шаруха, здарэнне адбылося напярэдадні снежня мінулага года ў кватэры аднаго з дамоў па праспекце Ракасоўскага. Паспрачаўшыся тады з братам, з якім яны пражываюць разам, падазроны ў запале і ўкусіў саперніка, пасля чаго пацярпелы быў вымушаны звярнуцца ў бальніцу. Між іншым, падазроны знаходзіцца зараз на лячэнні ў Рэспубліканскай клінічнай псіхіятрычнай бальніцы «Навінкі».

**Ігар ГРЫШЫН.**

### РАБОЧЫ ЎПАЎ З СЁМАГА ПАВЕРХА

**У Мінску на адным з аб'ектаў, які будуецца, з сёмага паверха выпаў муляр.**

Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, здарэнне зафіксавана на пачатку дванаццатай дня на адным з аб'ектаў на праспекце Пераможцаў. Няшчасны выпадак адбыўся, калі 55-гадовы жыхар Калінкавічаў, работнік аднаго з будаўнічых упраўленняў, працаваў на сваім участку: мужчына ўпаў з сёмага на пяты паверх і загінуў на месцы здарэння. Паводле папярэдняй інфармацыі, прычынай здарэння стала парушэнне загінулым тэхнікі бяспекі. Праверку на падставе гэтага факта праводзіць пракуратура Цэнтральнага раёна.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### НАРАБІЛА ПЕРАПАЛОХУ КУНІЦА

**У вёсцы Хадасы Камянецкага раёна з падворкаў сталі знікаць куры.**

Адзін з гаспадароў паставіў капкан, у які неўзабаве трапіла куніца. Яна ўжо паспела абдзерці рукі чалавеку перад тым, як была знішчана. Экспертыза пацвердзіла факт шаленства дзікага звера. Вяскоўцу давялося прайсці курс прафілактычнага лячэння супраць небяспечнай хваробы. Праз некалькі дзён у двор да жыхара вёскі Пруска Валгінава таксама забег хворы на шаленства звярок і напаў на сабаку.

Камянецкі раён — пушчанскі. І летась тут было зафіксавана 14 выпадкаў захворвання на небяспечную хваробу лясных жыхароў. А шалёны янот нават паралізаваў на дзень работу цэлай установы, у двор якой прабраўся.

**Яна СВЕТАВА.**

### АСЦЯРОЖНА: ФАЛЬШЫВЫЯ ДОЛАРЫ І РУБЛІ

**На мінулым тыдні затрымана некалькі чалавек, якія імкнуліся ў Баранавічах абмяняць фальшывыя грошы.**

У філіяле ААТ «ААБ Беларусбанк» 43-гадовы мужчына хацеў абмяняць падробленую 100-доларавую купюру. Такую ж купюру спрабаваў здаць у абменны пункт Белпрамбудбанка і падлетак. А ў разлікова-касавым цэнтры гэтага ж банка фальшывую тысячарублёвую расійскую купюру прад'явіла жанчына. Усе затрыманыя заявілі, што не ведалі пра тое, што ў іх фальшыўкі. Грошы былі завезены з Расіі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# Абразы як сімвал дабрыні беларусаў

**Прафесар, доктар мастацтвазнаўства Надзея Высоцкая прысвяціла жыццё таму, што вывучае мастацтва, якое ў мінулыя стагоддзі патрабавала толькі пакланення і захаплення, а ніяк не вывучэння. І вынікам яе працы стала чарговая кніга: «Сакральны жывапіс Беларусі XV—XVIII стагоддзяў», якая выйшла ў выдавецтве «Беларусь» і была прадстаўлена ў Нацыянальнай бібліятэцы.**

Праца Надзеі Высоцкай высока адзначана дзяржавай — яна была лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Але новы альбом, складальнікам якога яна з'яўляецца, прадстаўляе творы, што паходзяць з культавых калекцый Беларусі і Расіі. Сярод іх вялікая колькасць тых, якія да нядаўняга часу былі невядомыя. Абразы, алтарныя карціны, іканастасы, якія знаходзяцца ў храмах, і тыя, якія захоўваюцца ў музеях. Гэта не проста каштоўныя рэчы, яны нясуць боскае святло і асаблівыя талентам і пачуццямі людзей, якія іх стварылі. Ці ведаем, ці ўсведамляем мы, чым асаблівыя беларускія абразы? Затое на Захадзе Надзеі Высоцкай часта даводзілася чуць, што яны сапраўды асаблівыя — сваёй дабрынёй. Праваслаўныя помнікі ці каталіцкія, якія прадстаўлены ў кнізе, — яны паяднаныя тым, што дапаўняюць веды пра мастацтва Беларусі. І няхай жыве ў нас жаданне вярнуць у сваю краіну тыя помнікі, якія цяпер знаходзяцца за межамі: вяртанне пачынаецца тады, калі мы іх прымаем у сваё сэрца, у свядомасць, калі больш ведаем пра іх. Дзеля гэтага і з'явілася новая кніга.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Спрэчныя нататкі

# МАЁ І НАША

**Калі ў суседніх краінах прыватызацыя завершана ці заканчваецца, а ў нас дзяржаўна-грамадскі сектар яшчэ займае вядучае становішча, то захаваць «сацыялістычную нявіннасць» нашым прадпрыемствам няпроста. Адчуваецца не толькі знешні ціск. Дае ведаць пра сябе і ўнутраны.**

Дзяржаўна-грамадскі сектар эканомікі для некаторых з'яўляецца прыцягальным з той прычыны, што з'яўляецца шырокім полем для дзейнасці, але не на карысць роднага прадпрыемства і дзяржавы, а ў сваіх інтарэсах.

Здавалася б, у краіне ўсё пад кантролем: толькі адны інспектары пакідаюць прадпрыемства, як за імі прыязджаюць іншыя, а зладзеяў не меншае. Магчыма, нават ёсць пэўны прырост.

На прыватных прадпрыемствах розных парушэнняў таксама хапае, але там уласнік свой рубель беражэ і нават імкнецца ўхапіць чужое, напрыклад, не заплаціць падаткі. Але жыццё паказвае, што розныя махінатары найперш шчыруюць у дзяржаўна-грамадскім сектары. Яно і зразумела — над дзяржаўнай маёмасцю мала хто дрыжыць.

Я не буду пісаць, каго выкрылі і асудзілі па вобласці ў цэлым, а толькі прыцягну ўвагу чытача да выпадкаў, якія здарыліся ў суседніх з Баранавічамі раёнах.

Вось у Ляхавіцкім апошнім часам асудзілі чатырох кіраўнікоў сельгаскааператываў і адной з асуджаных была жанчына, якая кіравала СВК. Суд прыгаварыў яе да чатырох з паловай гадоў за тое, што старшыня прадавала трактары сваякам па заніжанай цане, а таксама збыла прадпрымальніку гандлёвае памяшканне, пры гэтым занізіўшы яго кошт у дзесяць разоў, але і тыя грошы родная гаспадарка не атрымала.

Чатыры кіраўнікі для раёна, у якім на сёння 12 гаспадарак — мнагавата.

У Ганцавіцкім раёне новы год пачаўся з «працэсу стагоддзя»: на лаву падсудных селі адразу 12 былых работнікаў спажывецкага таварыства раёна. Бухгалтары, загадчыкі магазінаў і прадаўцы абвінавачваюцца ў крадзяжы грамадскай маёмасці ў асабліва буйных памерах шляхам злоўжывання службовым становішчам, здзейсненым паўторна ці групай асобаў па папярэдняй змове... — гэта толькі адзін з пунктаў, прад'яўленых абвінавачваным.

Абвінавачваных абараняюць 11 адвакатаў — цэлы дэсант сабраны з усёй вобласці. Гэта і зразумела, бо па артыкулах, пад якія падпадаюць былыя супрацоўнікі райпо, можна атрымаць да 12 гадоў турмы з канфіскацыяй маёмасці.

Хачу звярнуць увагу на тое, што вышэйуказаная «спажывецкая кааперацыя» — прадпрыемства небагатае, тым не менш бок абвінавачвання на судзе ў Ганцавічах лічыць, што было выкрадзена матэрыяльных каштоўнасцяў на 100 млн рублёў.

А зараз вернемся ў Баранавічы. У мінулым годзе з артыкула «Зрэб'е» чытачы даведаліся пра буйныя махінацыі ў Баранавіцкім баваўняным аб'яднанні. Не буду паўтарацца, толькі напомню, што і там дзейнічала група супрацоўнікаў прадпрыемства. Былы гендырэктар «Белтэкста» атрымаў дзевяць з паловай гадоў калоніі і павінен выплаціць буйную грашовую кампенсацыю дзяржаве і баваўнянаму аб'яднанню. У гэтай справе неўзабаве будзе пастаўлена апошняя кропка, бо адзін з абвінавачваных уцёк ва Украіну і ёсць надзея, што яго здолеюць вярнуць.

Прыцягвае ўвагу адзін момант. Як устанавіла следства, кіраўніцтва канцэрна было ў курсе, што баваўняная тканіна адпраўляецца за мяжу на каландрыраванне (паляпшэнне якасці), але не надало гэтаму значэння...

А ў цэлым усё проста. Калі б прадпрыемства было прыватным, падобная афера ўвогуле была б немагчымай. Гаспадар сам сябе рабаваць не стаў бы.

І яшчэ адзін яркі прыклад. Пры праверцы ЗАТ «Шчара-Агра» Баранавіцкага раёна супрацоўнікі Дзяржкантролю ўстанавілі, што гаспадарка адпускала цеплаэнергію арандатару без усякага ўліку. У выніку страты выліліся ў 60 млн рублёў. Супраць дырэктара завялі крымінальную справу. Калі б тую цеплаэнергію кіраўнік аплачваў са сваёй кішэні, то гэтага не здарылася б.

Усё гэта нагадвае запушчаны педыкулёз. Як ні старайся, але без санапрацоўкі і прафілактыкі з вашывасцю не справіцца.

Многае залежыць і ад кіраўніка прадпрыемства, але таленавітых дырэктараў у кожным раёне можна пералічыць на пальцах, ды і яны часам не могуць кіраваць сітуацыяй. Калі калектыў глядзіць на дзяржаўнае як на чужое, то што можа змяніць адзін чалавек, няхай сабе і кіраўнік? Ды здараецца, што пры ўсёй добрасумленнасці ён дзейнічае ў рамках устаноўленых інструкцый.

На тэрыторыі гарпаліўзбыту ляжыць у штабелях кругляк, які ідзе на дровы. Тут жа рабочыя яго пілуюць. Вырашыў даведацца: а ці можна купіць гэты кругляк па цане дроў? Для прадпрыемства выгада відавочная, бо не трэба валтузіцца з тымі бярвенцамі — пілаваць і калоць іх. Прыватнік толькі ўзрадаваўся б і не пытаў для чаго табе той кругляк патрэбен: на паліва ці агароджу?

А тут усё ператварылася ў праблему.

— Мы прадаём толькі дровы, — пачулася ў адказ.

— Але ж для вас гэта выгадна. Вось вам грошы за два кубаметры і ўся размова, — не адступаў я.

— Хто можа даць дазвол?

— Калі Брэст дазволіць, то калі ласка.

І ў чым тут можна папракнуць дырэктара? Прадпрыемства займаецца збытам дроў, то іх трэба і прадаваць. Ёсць палажэнні, пастановы і неабходна прытрымлівацца іх, а выгада тут — справа другарадная. Яшчэ невядома, як на такі крок паглядзіць начальства і кантралёры.

Дык няўжо агульнадзяржаўная прыватызацыя — панацэя ад усіх праблем? Безумоўна, не! Крадуць і абдурваюць ва ўсім свеце. Успомнім, як кіруючыя чыноўнікі Японіі прылюдна плакалі і каяліся ў тым, што бралі хабар ці ўкралі пэўныя сумы. Але і яны былі на дзяржаўнай службе. А хіба дырэктар сусветнага банка не выплачваў сваёй каханцы зарплату большую, чым атрымлівае дзяржсакратар ЗША? Прыкладаў хапае.

Кожны можа раскідвацца сваімі грашыма як хоча, і калі прыватная фірма разарыцца, то там праблема найперш тых, хто з ёй звязаны.

Але калі рабуюць дзяржаўнае прадпрыемства, то праблема ўзнікае двайная. Мала таго, што людзі могуць застацца без працы, дык яшчэ крадуць нашы грошы. Але да ўсяго гэтага мы прывыклі і калі абураемся, то больш ужо па звычцы.

Нашага чалавека дзесяцігоддзямі вучылі, што дзяржаўнае — гэта наша, належыць усяму грамадству. Толькі ўсё аказалася марным. Маё пераважвае над астатнімі паняццямі. А калі так, то і не трэба чалавека перараблаць. Няхай кожны мае сваё і плаціць з яго падаткі. Гэта датычыцца прыватнікаў, хоць работнікаў па найму заўсёды пераважная большасць. Але ж такая сітуацыя ва ўсім свеце.

Беларуская эканоміка інтэграваная ў сусветную, а там пануе капіталізм. А калі так, то не трэба нам чухацца, а пастарацца як мага хутчэй прыстасавацца да сённяшняй рэчаіснасці.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Спорт-тайм

### БАТЭ перамог уладальніка кубка

У Санкт-Пецярбургу на «Кубку чэмпіёнаў Садружнасці-2008» чэмпіён Беларусі пераадолеў групавы этап, дзякуючы перамозе над дзеючым уладальнікам трафея ташкенцкім «Пахтакорам» — 2:1. Выйграць барысаўскаму БАТЭ дапамаглі галы Віталя Радзіонава і Максіма Скавыша. Акрамя таго, у сярэдзіне першага тайма нападаючы беларусаў Блізнюк не забіў пенальці. «Мы вельмі рады гэтай перамозе і выхаду ў чвэрцьфінал, — заявіў галоўны трэнер Віктар Ганчарэнка. — Аднак у нас ёсць дадатковыя цяжкасці — нам не зусім падыходзіць гэтае «маруднае» пакрыццё. Звычайна наша каманда стварае за гульню 6—7 момантаў, а тут 5—6 эпізодаў за ўсе тры матчы». Аднак, як кажуць, цішэй едзеш, далей будзеш.

Учора БАТЭ ў чвэрцьфінале перамог з лікам 2:1 грузінскі «Алімпі» з Кутаісі, які заняў першае месца ў групе «С». Галы забілі Блізнюк і Радзівонаў. У матчы за выхад у фінал барысаўчане будуць спаборнічаць з лепшай камандай сустрэчы «Хазар-Ленкарань» (Азербайджан) — «Шэрыф» (Малдова).

### Хамутоўскі ў клубе бундэслігі

Галкіпер нацыянальнай зборнай Беларусі па футболе Васіль Хамутоўскі падпісаў пагадненне з клубам другога нямецкага дывізіёна «Карл Цэйс» (Йена). Варатар будзе гуляць у Германіі як мінімум да 30 чэрвеня з правам застацца яшчэ на год. «Карл Цэйс» — другі нямецкі клуб Хамутоўскага: у сезоне 2000/2001 беларус выступаў за мангеймскі «Вальдхоф».

### У варотах Буфону няма роўных

Галкіпер турынскага «Ювентуса» і зборнай Італіі Джанлуіджы Буфон прызнаны лепшым варатаром у мінулым дваццацігоддзі.



Такія даныя распаўсюдзіла міжнародная федэрацыя футбольнай гісторыі і статыстыкі. Другое месца належыць варатару «Манчэстар Юнайтэд» і зборнай Даніі Петэру Шмейхелю. Трэці — немец Олівер Кан з «Баварыі».

### Пераможцу «Матча зорак» вызначалі па булітах

У Наваполацку адбылося хакейнае шоў «Матч зорак». У гэтай сустрэчы зборная экстралігі аказалася мацнейшай за каманду Мінска толькі дзякуючы серыі булітаў — 6:5. У складзе пераможцаў шайбы на свой рахунак запісалі Аляксандр Бараўкоў, Аляксей Круцікаў, Дзяніс Тыднюк, Аляксандр Усенка, Віктар Андрушчанка, Дзмітрый Ігошын, у сапернікаў шайбы закінулі Андрэй Макроў (двойчы), Сяргей Дзямагін, Арцём Сянькевіч, Віталь Люткевіч. У конкурсах на дакладнасць кідкоў і выкананне хакейных пенальці (яны праводзіліся ў перапынках) перамаглі ігракі сталіцы, а ў эстафеце — зборная экстралігі. Лепшымі ігракамі матча назвалі хакеіста «Віцебска» Дзмітрыя Ігошына, які рэалізаваў пераможны буліт, і аўтара двух дакладных кідкоў Андрэя Макрова з мінскага «Дынама». Спецыяльны прыз быў уручаны нападаючаму наваполацкага «Хіміка-СКА» Вадзіму Курага, у якога, дарэчы, у дзень гульні якраз нарадзіўся сын.

### Шахматны кароль вядомы

Міжнародны гросмайстар Аляксей Фёдараў стаў пераможцам 74-га чэмпіянату краіны па шахматах, а значыць, менавіта ён прадставіць Беларусь на кантынентальным першынстве. Прызавы фонд спаборніцтваў, якія праходзілі ў Мінску з 9 па 22 студзеня, склаў 4 мільёны рублёў. На рахунку чэмпіёна шэсць выйгрышаў і сем нічыйных вынікаў.

## Па чутках і аўтарытэтна

# БЯСПЕКА ПЕШАХОДАЎ — У РУКАХ ШВАЧАК?

**«Міністэрства ўнутраных спраў разаслала ўсім беларускім швейным прадпрыемствам ліст, у якім загадала нашыць на ўсю верхнюю вопратку, што выпускаецца ў краіне, з усіх бакоў святлоадбівальныя стужкі» — такая інфармацыя з'явілася днямі на беларускім Інтэрнэт-партале TUT.BY.**

Першая рэакцыя на паведамленне — гэта чыйсьці не вельмі ўдалы жарт, хоць бы таму, што цяжка ўявіць сабе элегантнае паліто ад «Элемы» са святлоадбівальнымі стужкамі. Ці што ўсе беларусы будуць у цемры «свяціцца»... Да таго ж логіка падказвае, што Міністэрства ўнутраных спраў не можа прымусіць швейнікаў выконваць свае прадпісанні. Таму, каб праверыць скандальную навіну, мы звярнуліся па тлумачэнні да спецыялістаў канцэрна «Беллегпрам».

— Сапраўды, пэўны час таму мы атрымалі ліст з Міністэрства ўнутраных спраў, у якім нам было прапанавана забяспечваць святлоадбівальнымі элементамі ўсю верхнюю вопратку, — патлумачыла **вядучы спецыяліст аддзела кіравання якасцю, маркетынгу і таварапрасоўвання канцэрна Ларыса НЯФЁДАВА.** — Але калі абапірацца на дзеючы стандарт, то да верхняй вопраткі адносяцца не толькі курткі ці паліто, а ўсё адзенне, якое апранаецца на гарсэтныя вырабы: гэта і блузы, і касцюмы, і жакеты, і пінжакі, і спадніцы, і штаны і г.д. Работнікі аўтаінспекцыі спадзяюцца такім чынам зменшыць колькасць дарожна-транспартных здарэнняў у цёмны час сутак. І іх памкненні, зразумела, маюць высакародную мэту. Але ж давайце будзем рэалістамі: усе нашы прадпрыемствы працуюць пад заказ гандлёвых арганізацый і Белкаапсаюза. А гандаль арыентуецца, у першую чаргу, на попыт спажыўцоў. Скажыце, вось вы асабіста захочаце хадзіць у класічным касцюме, які будзе свяціцца ў цемры? Ці калі ў цемры будзе свяціцца ваша футравая шуба? А нам жа прапануюць таксама прадумаць, як «упрыгожыць» святлоадбівальнымі элементамі і абутак, прычым не толькі спартыўны, а ўвесь, нават скураны. Калі ў спартыўных куртках, вятроўках, красоўках яшчэ можна неяк абыграць святлоадбівальныя элементы і яны будуць выглядаць там больш-менш арганічна, то што рабіць з усім астатнім адзеннем, мы проста сабе не ўяўляем. Тым больш што па патрабаваннях бяспекі для таго, каб чалавек сапраўды стаў бачны на цёмнай дарозе, святлоадбівальная стужка павінна ісці па абодвух рукавах, па спіне, па грудзях і па баках вопраткі. Бо зусім невядома, з якога боку на чалавека будзе падаць святло. І хто, цікава, захоча быць падобны на інспектара ДАІ?

Можна не сумнявацца, што нашы спажыўцы, і нават вясковыя жыхары, для якіх пытанне бяспекі на дарогах асабліва актуальнае, не захочуць набываць беларускія тавары, а адпраўляцца на рэчавыя рынкі па звычайнае адзенне. Адна справа — замацаваць у цёмны час сутак на вопратцы ці сумках святлоадбівальныя элементы або флікеры, і зусім іншая — свяціцца як навагодняя ёлка. Выкажу ўласнае меркаванне, што апошнім часам колькасць пешаходаў, якія пазначаюць сябе ў цемры, значна павялічылася, прычым не толькі ў сельскай мясцовасці, але і ў сталіцы. Увогуле сітуацыя на дарогах залежыць у многім і ад культуры аўтамабілістаў, і ад культуры пешаходаў, і ад стану нашых дарог, і ад асвятлення. Таму перакладваць усю адказнасць за паляпшэнне сітуацыі на дарогах на швейныя прадпрыемствы — будзе няправільна. Наша штодзённае адзенне — гэта не спецвопратка. Ёсць арганізацыі, дзе ўсе работнікі абавязаны насіць спецвопратку, але заўважу, што той жа МУС не заказвае на прадпрыемствах канцэрна «Беллегпрам» для сваіх работнікаў пашыў адзення. Пэўны час таму нам было рэкамендавана насыціць гандаль святлоадбівальнымі элементамі. Мы гэта зрабілі, і сёння ўжо прапанова нашмат перавышае попыт.

Да 1 лютага канцэрн «Беллегпрам» павінен прадставіць у Дзяржстандарт свае прапановы па карэкціроўцы стандарта па верхняй вопратцы. У стандарце па дзіцячым адзенні сёння ў нас прадугледжана магчымасць прымянення святлоадбівальных элементаў. Але вытворцы самастойна вырашаюць, дзе будзе да месца выкарыстанне тканін-флікераў. Абавязковым з'яўляецца толькі выкарыстанне флікераў у школьных ранцах і заплечніках беларускай вытворчасці. Таму, спадзяёмся, што разумны сэнс усё ж такі пераможа.

Тым больш не варта скідваць з рахунку і пытанне канкурэнтаздольнасці. Усе суб'екты рынку павінны канкурыраваць у роўных умовах. Нам і сёння вельмі складана «змагацца» са шматлікімі рэчавымі рынкамі. А калі кагосьці і сапраўды хвалюе бяспека вясковых жыхароў, няхай Белкаапсаюз робіць адпаведны заказ, і мы будзем пад яго шыць вопратку са святлоадбівальнымі элементамі. Мы, дарэчы, шыем адзенне з выкарыстаннем тканін-флікераў, пачынаючы з 2001 года, але павышаным попытам яно не карыстаецца. Таму, на нашу думку, прымус — гэта не выйсце, бо ў такім разе давядзецца прымушаць насіць наша адзенне і пешаходаў. А гэта, прабачце, нонсенс. Праблема дарожнага траўматызму — вельмі актуальная, і для яе вырашэння патрабуюцца намаганні многіх міністэрстваў і ведамстваў, правядзенне тлумачальнай работы, сацыяльная рэклама. Плюс, абавязкова, павышэнне культуры пешаходаў. А мы зможам выканаць любы заказ, калі будзе такая неабходнасць...

Па каментарый мы звярнуліся таксама і ў Міністэрства ўнутраных спраў.

— Сітуацыя з гібеллю на дарогах людзей нас вельмі хвалюе. Таму восенню мінулага года гэта пытанне выносілася на разгляд Пастаяннай камісіі па бяспецы дарожнага руху пры Савеце Міністраў, — паведаміў журналісту «Звязды» **старшы інспектар Упраўлення ДАІ Міністэрства ўнутраных спраў Фёдар ГУЛІЦКІ.** — У прыватнасці, было прапанавана максімальна забяспечваць верхнюю вопратку як для дзяцей, так і для дарослых святлоадбівальнымі элементамі. Гэта робіцца выключна для бяспекі пешаходаў. Сапраўды, сёння ў продажы шырока прадстаўлены флікеры і святлоадбівальныя стужкі. Але практыка, на жаль, сведчыць аб тым, што флікеры і ахоўныя стужкі знаходзяцца ў многіх у сумках ці ў кішэнях, ці мацуюцца ў такіх месцах, што пешаход усё роўна застаецца нябачным для вадзіцеляў. Мы таксама прапануем, каб кіраўнікі арганізацый паклапаціліся аб набыцці спецадзення для сваіх работнікаў. Гэта датычыцца ў першую чаргу тых работнікаў, якія працуюць у вулічных умовах. Але і штодзённае адзенне павінна таксама забяспечвацца святлоадбівальнымі элементамі. Спадзяёмся, што нас у нашым імкненні захаваць людзям жыццё многія падтрымаюць...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## А на мой погляд

# Флікеры гатовыя насіць пераважна на «ліпучках»...

***Ці носіце вы асабіста на адзенні ў цёмны час сутак святлоадбівальныя элементы — флікеры? Як вы ставіцеся да рэкамендацыі МУС прадпрыемствам прамысловасці наносіць іх на ўсю верхнюю вопратку? Дарэчы, як асветлены ў вячэрні час вуліцы вашага населенага пункта?***

**Алена ЗДАНОВІЧ,** *маці шасцярых дзяцей, у тым ліку пяцярых школьнікаў, вёска Наркуны Лідскага раёна:*

Абавязкова носім. За адсутнасць флікераў у нашай і іншых вёсках, падаецца, нікога не штрафавалі, але папераджальныя гутаркі прынамсі з дзецьмі праводзілі дакладна. Што да рэкамендацый, пра якія вы кажаце, дык мне падаецца, што дастаткова тых флікераў, якія можна насіць, скажам, на рукаве. Пра асвятленне вёскі скажу, што на яе ўсю ёсць чатыры ліхтары: асветлены уезд—выезд, ды некалькі ліхтароў ёсць на трасе...

**Надзея КАНДРАХОВА,** *працуе прыбіральшчыцай на ферме № 3 СВК «Вішнявецкі» Стаўбцоўскага раёна:*

— Нічога не нашу, паколькі хаджу на працу ўдзень, а ўвечары выходзіць кудысьці ў мяне няма патрэбы. Пра штрафы, вядома, чула, але ў нас да гэтага пакуль не даходзіла, абмяжоўваліся прафілактычнымі гутаркамі. Наконт верхняга адзення з флікерамі... А калі гэта будзе найпрыгажэйшая сукенка (*смяецца*), як тады? Лепш асобна флікер начапіць. А ліхтароў у нашай вёсцы дакладна тры: на ўездзе—выездзе і «па вялікім патрабаванні» побач з домам інваліда.

**Анатоль МЯЦЕЛЬСКІ**, *начальнік аддзела перавозак і кантролю дачынага ўнітарнага прадпрыемства «Аўтобусны парк № 2 г. Слуцка»:*

— А як жа, усе ў нашай сям'і добраахвотна носяць флікеры. Удзень, напрыклад, святлоадбівальны элемент у мяне знаходзіцца на ручцы сумачкі-барсеткі, а ўвечары перавешваю яго на рукаў верхняга адзення. Я сам вадзіцель, таму ведаю, што заўважны такі элемент нават на сумачцы, хоць, бясспрэчна, найбольшы эфект ад яго, калі ён на адзенні, на рукаве, напрыклад. Пра асвятленне не скажу, што яно вельмі добрае — хутчэй, здавальняючае, калі гаварыць у маштабах горада. Бо цэнтральныя вуліцы асветлены значна лепш, чым ускраіны.

**Алена ЛУЖЫНСКАЯ,** *маці траіх дзетак, знаходзіцца ў водпуску па догляду, вёска Гардынава Валожынскага раёна:*

— Усе носяць: і я, і муж, і дзеці. На сумках, на адзенні. Гэта правільна, бо дзеці, напрыклад, вяртаюцца з музычнай школы ўжо ў цёмны час сутак. Мне падаецца, флікеры лепш выкарыстоўваць на «ліпучках», калі і наносіць такія элементы на адзенне пры вырабе, дык толькі на спартыўнае. На дарагой рэчы я не хацела б мець такі ўшыты флікер. Яшчэ з месяц таму ў нас былі праблемы з асвятленнем вёскі — калі ночы былі самымі доўгімі. Цяпер вуліцу бачна...

**Любоў БАЛАЎНЁВА,** *намеснік дырэктара Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі:*

— Не нашу, ніхто ў сям'і не носіць, хоць трэба было б іх набыць. Напрыклад, сын у гарадскім транспарце ўвечары вяртаецца. Гэта я пра сябе як пра пешахода кажу, бо я яшчэ і аўтааматар. Увечары, асабліва пры неспрыяльных умовах надвор'я, флікеры сапраўды вельмі карысныя — пешахода заўважыш здалёк. На ваша другое пытанне адкажу так: трэба, каб у гэтым выпадку над адзеннем добра папрацавалі дызайнеры, каб ушытыя святлоадбівальныя элементы былі дарэчы, не псавалі знешні выгляд рэчы. Прычым, я маю на ўвазе найперш нейкія дэмісезонныя, шчыра кажучы, на летняй вопратцы такія флікеры бачыць не хацелася б. Асвятленне вуліц ацэньваю як слабаватае. Прынамсі, калі гаварыць пра пасёлак Праўдзінск Пухавіцкага раёна. Ліхтары ёсць, але іх не ўключаюць...

**Святлана САРВІРАВА,** *намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Гомельскага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа:*

— У сям'і носяць святлоадбівальныя элементы ўсе: дзіця і муж — на вопратцы, я — на сумачцы.У прынцыпе, я не супраць, каб на адзенне наносіліся флікеры пры яе вытворчасці. Адзінае, патрэбны густ, мера, праца дызайнераў. На футра, безумоўна, лепш іх не наносіць, але ў цэлым на зімовае адзенне, найперш курткі — чаму б не. З летнімі рэчамі справа іншая, напэўна, не кожны і не кожную канкрэтную з іх у такім выпадку будзе насіць. Найперш у гарадскіх межах падключыце ўсе ліхтары — і пешаходы нават без флікераў будуць бачнымі здалёк...

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

# ПРАДУКТЫ ПАДАРАЖЭЛІ НА 2,8 ПРАЦЭНТА

**Цэны на асноўныя прадукты харчавання ў Беларусі за студзень-снежань 2007 года павялічыліся на 15,9 працэнта, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу. У снежні адносна лістапада гэты прырост склаў 2,8 працэнта.**

Мінімальна ўзраслі цэны на алкагольныя напіткі — усяго на 0,2 працэнта і безалкагольныя — на 0,6 працэнта. Не змянілася толькі цана на цукар. Сярэдняя цана на свініну ў снежні складала Br8869, што на Br449 даражэй, чым у лістападзе. Самыя нізкія цэны (Br7450—7730) былі ў Століне, Верхнядзвінску, Ваўкавыску, Клімавічах і Чавусах, а самыя высокія — у Пінску, Наваполацку, Мінску, Бабруйску, Горках — па Br9210—12000 за 1 кг. Верхняя мяжа цэн на свініну ў снежні ўзрасла на Br390—2000. Цана бульбы ў сярэднім па рэспубліцы ў снежні складала Br683, што на Br63 даражэй, чым у лістападзе. Самыя нізкія цэны на «другі хлеб» былі ў Рагачове, Жыткавічах, Ашмянах, Стоўбцах, Клімавічах — па Br450-490, што на Br80 даражэй, чым у лістападзе.

Самыя нізкія цэны на асноўныя прадукты ў снежні 2007 года былі ў Стоўбцах, Рагачове і ў Клімавічах, а самыя высокія — у Мінску, Брэсце, Наваполацку, Салігорску, Оршы, Барысаве, Бярозе, Бабруйску.

## Результаты финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Лифтсервис» за 2007 год

УНН100088852

| № П/П | Наименование показателей | Ед. изм. | 2007 год |
|---|---|---|---|
| 1 | Выручка от реализации работ (услуг) | млн руб. | 17 008 |
| 2 | Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | млн руб. | 14 510 |
| 3 | Прибыль от реализации товаров, продукции, работ, услуг | млн руб. | 2 179 |
| 4 | Начисленные налоги и сборы из прибыли | млн руб. | 634 |
| 5 | Дебиторская задолженность | млн руб. | 2 552 |
| 6 | Кредиторская задолженность | млн руб. | 561 |
| 7 | Чистая прибыль, всего<br>в том числе:<br>расходы на оплату труда из чистой прибыли | млн руб. | 901<br><br>624 |
| 8 | Направлено чистой прибыли на увеличение уставного фонда | млн руб. | 0 |
| 9 | Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн руб. | 162 |
| 10 | Дивиденды на одну акцию, выплаченные в данном отчетном периоде, всего | руб. | 800 |
| 11 | Количество акционеров, всего<br>в том числе:<br>юридических лиц<br>физических лиц | чел.<br><br>% акций<br>чел. | 801<br><br>19,08<br>800 |
| 12 | Среднесписочная численность работающих | чел. | 858 |

**Директор ОАО «Лифтсервис» М.М. Ботян**
**Главный бухгалтер С.Ф. Шорец**

## УП «Минский городской центр недвижимости» информирует

В соответствии с решением комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при администрации Ленинского района г. Минска **аукционные торги по продаже здания градирни ОАО «Камволь», объявленные на 14 февраля 2008 г., приостанавливаются.** Новая дата аукциона будет сообщена дополнительно.

УП «Минский городской центр недвижимости». УНП 190398583

# ГЛАБАЛЬНАЯ ПОШТА Ў ЛІЧБАХ І ФАКТАХ

**Нядаўна Сусветны паштовы саюз ААН (СПС) распаўсюдзіў заяву, у якой утрымліваецца аптымістычная для мільёнаў супрацоўнікаў традыцыйных паштовых службаў і карыстальнікаў іх паслугамі інфармацыя.**

Аказваецца, што нягледзячы на розныя факсы і іншыя каналы сучаснай сувязі, трыумфальнае шэсце па планеце электроннай пошты, паслугі звычайнай пошты, тым не менш, застаюцца запатрабаванымі ў свеце. Больш за тое, яна насуперак жорсткай канкурэнцыі працягвае ўмацоўваць свае пазіцыі. Так, згодна з дадзенымі СПС, паштовы абмен пісьмамі, колькасць пасылак расце. У 2006 годзе (больш свежых лічбаў няма) валавы паштовы абарот склаў 433 млрд паштовых адпраўленняў. Прычым унутры краін іх абарот крыху вырас, праўда, на два працэнты знізіўся міжнародны абарот. Затое колькасць пасылак за мінулы год (як унутраных, так і міжнародных) павялічылася на 4,8 працэнта і склала 6235 млрд штук.

Самы вялікі рост унутраных пасылак назіраўся ў Афрыцы — 11,7 працэнта, міжнародных — у краінах Усходняй Еўропы і СНД. Там іх колькасць узрасла на 21,4 працэнта.

Адпаведна павялічваюцца глабальныя даходы паштовых службаў. У 2006 годзе ў параўнанні з папярэднім іх агульны прыбытак павялічыўся на 13 працэнтаў і склаў 308,1 млрд долараў ЗША. Больш за палову гэтых грошай атрымана за лік пісьмаў, яшчэ больш за чвэрць — за дастаўку пасылак і паслугі забеспячэння.

Некалькі цікавых лічбаў. Пісьмаў больш за ўсіх у свеце дасылаюць швейцарцы — 713 штогод на душу насельніцтва, а пасылак японцы — 18,1.

Увогуле ў паштовых службах свету працуе больш за 5,5 млн чалавек. З іх самая вялікая служба ЗША — 796 199 супрацоўнікаў, самая малая — у Вануату, толькі 37 служачых. Менш за ўсё паштовых адзяленняў — чатыры — ў Ватыкане, а больш за ўсё ў Індыі — 155 333.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# У ІМЯ ВОЕНАЧАЛЬНІКА АНГЕЛАЎ

**Адчуванне, што такое «прыход», нараджаецца недзе ўнутры цябе, калі стаіш у цесным памяшканні, прыстасаваным пад храм, і молішся разам з незнаёмымі табе людзьмі пра адно і тое ж. Гэта менавіта адчуванне, а не разуменне. Бо ў нейкі момант табе пачынае здавацца, што ты ведаеш гэтых людзей. Ты можаш гадамі не ведаць іх імёны, толькі здагадвацца пра ўзровень дабрабыту, меркаваць пра нацыянальнасць, занятак, сямейнае становішча, але ў нейкі момант адчуваеш, што яны ўжо не проста знаёмыя табе, а амаль што родныя. Падчас набажэнства, незалежна ад тваёй волі, унутры цябе раптам нараджаецца дзіўнае светлае пачуццё да іх. Гэта сапраўды, дзіўнае, нідзе і ніколі раней табой не зведанае пачуццё любові да чужых, такіх розных, і фактычна незнаёмых людзей. І калі выпадкова сустракаешся з імі позіркам, то бачыш, што і яны адчуваюць да цябе тое ж самае.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Прыхажанін Свята-Міхайлаўскага храма Васіль ГАРОШКА.

Паступова ты больш даведваешся пра іх. Аказваецца, сагнутую бабульку, што прыходзіць на набажэнствы на мыліцах, завуць Аляксандра. А сямейная пара, якая штораз аказваецца злева ад цябе, працуе ў салоне прыгажосці на другім баку горада. Але на самай справе не ўзнікае ніякай цікаўнасці, гэтыя і іншыя сведчанні ўжо не ўплываюць на тваё стаўленне да гэтых людзей. Табе не важна, кім працуе высокі і басавіты Андрэй, і як прыйшоў да веры вялізны рыжабароды бацька чатырох маленькіх і прыгожанькіх як анёлы дзяўчынак. Бо ты ведаеш пра іх нешта самае галоўнае. Тое, пра што могуць не здагадвацца іх сябры, супрацоўнікі, нават родныя браты і сёстры. Ты ведаеш, якое дзіўнае святло прасвечвае ў іх вачах, калі яны цiснуцца, каб прапусціць прычаснікаў да «цеплыні» (астылы кіпень і лустачка просвіры, якія ўжываюць пасля прычасця). Ты ведаеш, якімі светлымі, ззяючымі робяцца іх твары, калі яны радасна адказваюць святару на велікоднае вітанне: «Сапраўды ўваскрос!» Ёсць нешта невытлумачальнае, непрыметнае і ні на што не падобнае ў самой сутнасці таго, што называецца прыходам. У еднасці такіх розных звонку людзей. У любові, якая напаўняе, ахінае ўсіх падчас набажэнства.

Прыход храма святога Архангела Міхаіла ў Мінску — адзін з амаль тысячы чатырохсот праваслаўных прыходаў нашай краіны. Ён самы заходні ў сталіцы — знаходзіцца ў статысячным мікраараёне Сухарава. Побач з колькасцю жыхароў раёна колькасць прыхаджан — жменька, хоць у нядзелю часовы храм запоўнены так, што руку для крыжовага знамення свабодна не падымеш. А нарадзіўся прыход, калі амаль дзесяць гадоў таму разам сабраліся ўсяго толькі 24 чалавекі. Яны з будучым настаяцелем айцом Ігарам Галаковым і вырашылі стварыць рэлігійную абшчыну ў імя архангела Міхаіла — Военачальніка ангельскіх сілаў. Гэта падзея адбылася ў адным з класаў нядзельнай школы Мінскага храма «Усіх тужлівых Радасць» у чэрвені 1998 года. У кастрычніку таго ж года прыход быў зарэгістраваны гарадскімі ўладамі.

Вернікі кажуць: патрабавалася яшчэ два гады малітваў, каб вызначыць і ўзгадніць месца будучага храма. У хуткасці на перакрыжаванні вуліц Шаранговіча і Янкоўскага з'явіўся чыгуначны вагон, які за месяц быў пераабсталяваны пад часовую царкву. На Раджаство 2001 года ў ім адбылася першая Літургія. З таго часу пачаліся праектныя работы па будаўніцтве праваслаўнага храма ў Сухараве. Напрыканцы кастрычніка 2005-га Свята-Міхайлаўскі прыход атрымаў, нарэшце, дазвол на будаўніцтва. Праз некалькі дзён будаўніцтва было распачата.

У выніку на захадзе Мінска, у буйным спальным раёне паміж Брэсцкім і Гродзенскім напрамкамі павінен з'явіцца праваслаўны комплекс. Галоўны храм вышынёй 35 метраў, у якім свабодна ўмесціцца 500 чалавек, хрысцільная царква, капліца і нядзельная школа.

— Сёння выкапаны катлаван і забіты ў зямлю 325 паляў для фундамента будучага храма, — расказвае настаяцель айцец Ігар. — Гэта работа патрабавала шмат выдаткаў: і грунт «падарыў» нечаканасці — сухое рэчышча, з-за якога колькасць паляў была павялічана, і будаўнікі не адразу знайшліся добрасумленныя. Тым не менш, з Божай дапамогай, гэта частка работы набліжаецца да завяршэння і недалёкі ўжо той дзень, калі можна будзе закласці ў фундамент капсулу з граматай аб пачатку будаўніцтва храма.

Кожную нядзелю пасля набажэнства настаяцель расказвае прыхаджанам пра ход будаўніцтва, пра ўсе складанасці, нюансы і поспехі ў гэтай нялёгкай агульнай справе. Кожны, хто пераступае парог гэтай царквы, дачыняецца да будаўніцтва ўжо тым, што купляе свечку, падае малітоўную запіску. Сродкі збіраюцца па кроплі. Раён спальны, прадпрыемстваў, на дапамогу якіх можна было б разлічваць, тут няма. Будуецца храм амаль цалкам за кошт прыватных ахвяраванняў: хто колькі зможа.

Прыход — гэта не толькі людзі, якія сустракаюцца падчас набажэнстваў. Гэта асаблівае жыццё пад засенню храма. Гэта магчымасць раскрыць свае таленты ў дзейнай любові да блізкага. Таксама ахвяраванне, але ўжо не грашыма, а сваім часам і сіламі. Дзевяноста дзяцей і дарослых наведваюць нядзельную школу Свята-Міхайлаўскага прыхода. Сястрыцтва ў гонар святой блажэннай Матроны Маскоўскай разам з іерэем Анатолем Дубінцом апякае 4-ю мінскую клінічную бальніцу. Айцец Віталій Кубар, трэці прыходскі святар, курыруе Маладзёжны цэнтр. Стараста храма Аляксандр Несцярчук падтрымлівае сувязь з ветэранскай арганізацыяй раёна. Прыход удзельнічае ў праваслаўных выстаўках, здзяйсняе паломніцтвы ў манастыры, плануе стварыць сямейны клуб. Увогуле, задум шмат. Ужо ўвесну павінна з'явіцца хрысцільная царква. Галоўнае, безумоўна — будаўніцтва асноўнага храма. Якое, як вядома, вядзецца не толькі на зямлі. Кожны чалавек, кажуць, будуе свой уласны храм у душы. То рушацца, то ўзнімаюцца, у залежнасці ад нашых учынкаў, нашы храмы на небе. І як адлюстраванне тых двух, як надзея, як дапамога, як апора — паўстаюць храмы ў нашых гарадах і вёсках. Поспех будаўніцтва ўсіх трох, узаемазвязаных паміж сабой, цалкам залежыць ад нас.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

*Разліковы рахунак, на які можна ахвяраваць сродкі на будаўніцтва Свята-Міхайлаўскага храма ў Мінску: 3015208900015 у філіяле ТАА «Белаграпрамбанк» — «Мінгардырэкцыя» ў г. Мінску, вул. Альшэўскага, 24, код 963. Тэлефон: 8 017 259 56 22, факс 259 59 81.*

## Усміхнёмся!

Дзве сяброўкі.

— У мяне ідэальны муж.

— Чаму?

— Ён заўсёды памятае, калі ў мяне дзень нараджэння, але ў той жа час заўсёды забывае, колькі мне гадоў.

☺

**Вадзіцелям да ведама.**

**Сігналізацыя «крычала» не таму, што разбілі акно машыны, а разбілі акно, таму што «крычала» сігналізацыя...**

☺

Конь — каню:

— Няшчасная я істота! Гаспадар трапіўся — жахлівы эксплуататар: з раніцы да ночы працую!

— А ты напішы скаргу ў грамадства абароны жывёл.

— Ты што! Калі гаспадар даведаецца, што я ўмею пісаць, прымусіць яшчэ і ў канторы дапамагаць!

☺

**Пацыент збівае нагамі псіхіятра, які ляжыць на падлозе:**

**— Гэта хто нервовы?! Гэта я нервовы?!**

**ОАО «Минскторгмаш» сообщает о проведении очередного общего собрания акционеров, которое состоится 28 февраля 2008 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 22, бухгалтерия Общества.**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

- Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2007 г.
- Отчет ревизора.
- Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках Общества.
- О выплате дивидендов за 2007 г.
- О проекте распределения чистой прибыли на 2008 г.
- Об избрании членов наблюдательного совета и ревизора.
- Об установлении вознаграждения для членов наблюдательного совета и ревизора.
- Об уменьшении уставного фонда Общества.
- О внесении изменений в устав Общества.

**Регистрация начинается в 14.30. При себе иметь паспорт.**

Наблюдательный совет.

**Усіх,**

каму ***СШ № 1 г. Ляхавічы*** Брэсцкай вобласці дала пуцёўку ў жыццё, запрашаем на вечар сустрэчы «Школа святкуе 140-гадовы юбілей». Святочны вечар адбудзецца 2 лютага 2008 года.

***Чакаем вас, выпускнікі!***

Аргкамітэт.

Віншую дарагога зяця **Віктара Вікенцьевіча ДУДЗІЧА** з г.п. Воранава з днём нараджэння.
Жадаю здароўя,
доўгіх гадоў жыцця,
поспехаў у працы.
**Цешча,** *в. Яманты.*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.10 | 16.33 | 8.23 |
| Віцебск — | 8.05 | 16.17 | 8.12 |
| Магілёў — | 8.00 | 16.23 | 8.23 |
| Гомель — | 7.50 | 16.26 | 8.36 |
| Гродна — | 8.24 | 16.50 | 8.26 |
| Брэст — | 8.18 | 16.57 | 8.39 |

**Месяц**

***Поўня.***
***Месяц у сузор'і Дзевы.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Мікалая, Міхаіла, Уладзіміра, Фёдара;*
***К.*** *Мілены, Феліцыі, Эрыкі, Рафала, Роберта, Фелікса, Францішка, Цімафея.*

## НАДВОР'Е на заўтра




### ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА -2..0°С | КІЕЎ 0..+2°С | РЫГА +1..+3°С |
| ВІЛЬНЮС 0..+2°С | МАСКВА -3..-1°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ 0..+2°С |

## 24 студзеня

*Дзве даты*

**1873 год** — 135 гадоў таму ў Мінску быў заснаваны водаправод — найстарэйшае на сёння камунальнае прадпрыемства горада. Вадапомпавая станцыя размяшчалася на Захар'еўскай вуліцы, на правым беразе Свіслачы (набярэжная з боку цырка). Нягледзячы на блізкасць ракі, забор ажыццяўляўся не з яе, а з грунтовых водаў. Многія гады водаправод абслугоўваў толькі цэнтральную частку горада, развіццё сеткі ішло павольна, не было сродкаў. Нават для таго каб рамантаваць лініі, гарадская ўправа вымушана была пазычаць грошы ў прыватных асобаў.




**1924 год** — у Шамані (Францыя) пачаліся першыя зімовыя Алімпійскія гульні. МАК нейкі час не прызнаваў іх, таму афіцыйна яны называліся Зімовым спартыўным тыднем.

*Цытата дня:*

***«Людзям, якім заўсёды няма калі, звычайна нічога не робяць».***

**Георг Ліхтэнберг (1742—1799), нямецкі пісьменнік-сатырык.**

**55**

Віншуем дарагога татачку і мужа **Анатолія Аляксандравіча КОРШУНА** з вёскі Нягневічы Навагрудскага раёна з *55-годдзем.*

***Жадаем кахання, цяпла і дабра,***
***Каб усе няўдачы згарэлі да тла,***
***Каб жыць не тужыць год да ста давялося,***
***Хай збудзецца ўсё, што яшчэ не збылося.***

**Родныя.**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




## ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Сканворд (19 студзеня).** **<u>Па гарызанталі:</u>** Беларусь. Гарох. Тур. Акуляр. Жаба. Рот. Гума. Рыбец. Даха. Эліта. Ікар. Лот. Пума. Калька. Рак. Аўра. Кій. Марс. Одра. Разак. Брама. Нуда. Зіма. Фараон. Трак. Корж. Зарад. Сага. Ярка. Украіна. **<u>Па вертыкалі:</u>** Куба. Ураднік. Маўр. Ліга. Акрабат. Магія. Расія. Рым. Сафа. Борт. Мак. Ігар. Каса. Ліхтар. Кітай. Абора. Убор. Зло. Рагу. Краты. Акын. Наждак. Бэра. Мел. Ліман. Ціль. Азу. Ток. Рад. "Апасіяната". Скарбонка.

## ПРЫЙШОЎ З БУТЭЛЬКАЙ

**У адну з сярэдніх школ Баранавічаў зайшоў 20-гадовы п'яны беспрацоўны і пачаў там «наводзіць парадак».**

Пад руку п'янаму трапіў школьнік, якога той стукнуў па галаве бутэлькай.

Падлетак быў траўмаваны, а хулігана затрымалі і ўзбудзілі крымінальную справу.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# Крынічка

*«Цякла тут з лесу невялічка*
*Травой зарослая крынічка».*
**Якуб КОЛАС.**

***Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81*** **№ 1 (252)**

## Цуда-лекар, ці Растаропша плямістая



**Большасць людзей ведаюць пра гэтую расліну не па чутках. У яе ёсць яшчэ іншыя назвы: Мар'іны калючкі, жабнік (у маладым узросце нагадвае жабу).**

У легендзе пра выдатную лекавую расліну расказваецца аб хворым чалавеку, які маліўся за сваё выздараўленне. Аднойчы ў сне яму з'явілася Дзева Марыя і сказала: «Падарунак мой знойдзеш ля свайго парога». Ранкам чалавек выйшаў з дома, наткнуўся на нейкую калючку, абадраў рукі і ногі і са злосцю вырваў яе з коранем. На зямлю пасыпалася насенне. Тут чалавек успомніў пра свой сон і кінуўся збіраць яго. Гэтым насеннем ён і вылечыўся.

Яшчэ ў адной легендзе гаворыцца: «Назва гэтай расліны пайшла ад імя Багародзіцы. Дзева Марыя хавалася з маленькім Ісусам у зарасніку растаропшы, калі карміла дзіця. Малако капнула на лісце расліны, ад гэтага на іх засталіся белыя плямы».

Са старажытных часоў людзі выкарыстоўваюць унікальныя лекавыя якасці растаропшы, з яе насення вырабляюць такія вядомыя лекавыя прэпараты, як карсіл, легалон, сілібор і інш. Гэта вельмі моцная лекавая расліна, якая дапамагае пры лячэнні хвароб пячонкі: гепатыту, цырозу, жаўтухі, паражэнняў ад алкаголю, лякарстваў, таксінаў, радыяцыі. Прымяняюць яе ў народнай медыцыне і пры халецыстытах, калітах, запаленні жоўцевых пратокаў, жоўцекамянёвай хваробе, пры расшырэнні венаў, ацёках, атлусценні, хваробах селязёнкі і шчытападобнай залозы.

Больш за ўсё карысных рэчываў змяшчае насенне растаропшы. Але гаючымі з'яўляюцца і лісце, і карані. Сок лісця ў народнай медыцыне выкарыстоўваюць пры запорах, запаленні слізістай абалонкі, кішэчніка і страўніка. Адварам карэння і сокам лісця лечаць суставы, радыкуліт.

У эпоху Сярэднявечча растаропша плямістая ўпрыгожвала раскошныя сады феадалаў. І сёння гэту расліну можна з поспехам выкарыстаць у зялёным будаўніцтве. Знаходлівыя гаспадары дачных участкаў выкарыстоўваюць растаропшу ў якасці жывой агароджы. Для гэтага яе пажадана сеяць пад зіму. Калі вам не патрабуецца лячэнне, то ўсё роўна ёсць сэнс пасадзіць гэту расліну на ўчастку — яна вельмі дэкаратыўная. А яе калючасць таксама саслужыць вам службу — абароніць ад няпрошаных гасцей. Добра пасадзіць растаропшу ля веснічак — дапамагае ад дурнога вока.

Вось якая гэта цудоўная расліна: і лечыць, і засцерагае, і радуе вока.

## Карысна ведаць

Нямногія ведаюць, што у моркве ёсць фітанцыдныя рэчывы, якімі так славяцца цыбуля і часнок і якія садзейнічаюць ачышчэнню поласці рота ад мікробаў. Але пры гэтым морква пазбаўлена таго спецыфічнага паху, які адпужвае многіх ад цыбулі і часнаку. Так што часцей ешце моркву.

## Такая вядомая ўсім капуста



У капусце ў значных прапорцыях змяшчаецца мноства карысных рэчываў. Перш за ўсё гэта клятчатка, якая, гаворачы медыцынскай тэрміналогіяй, стымулюе маторную функцыю кішэчніка, садзейнічае жыццядзейнасці карыснай кішэчнай палачкі, узмацняе вывядзенне з арганізма халестэрыну. Адсюль высновa: капуста перашкаджае развіццю атэрасклерозу. Яшчэ адна добрая вартасць — у капусце мала цукру. Але яна багата на мінеральныя солі, у вялікай колькасці змяшчае солі фосфару, кальцыю, марганцу, жалеза, ферменты, фітанцыды, арганічныя кіслоты. Яшчэ Піфагор адзначаў высокія танізуючыя ўласцівасці, якімі валодае капуста, яе здольнасць «падтрымліваць бадзёрасць і вясёлы настрой». Здробненыя капусныя лісты, змешаныя папалам з сырым яечным бялком, наносяць на незагойвальныя язвы і апечаныя месцы. Квашаная капуста і яе сок прымяняюцца пры лячэнні цынгі. Капуста — каштоўны прадукт лячэбнага харчавання пры сардэчна-сасудзістых захворваннях.

## Паліванне зімой

Для пакаёвых раслін найбольш спрыяльны рэжым 18—20 градусаў. У час ацяпляльнага сезона нашы пакаёвыя расліны могуць пацярпець ад сухасці паветра. Часцей апырсквайце іх, але не дапускайце моцнага паліву. Расліны зімой знаходзяцца ў стане спакою, у іх пагаршаецца дыханне каранёў. Вельмі часта расліны пакутуюць ад каранёвай гнілі.

Каля самай аконнай шыбы ставяць кактусы і іншыя сукуленты, зімой іх не ўдабраюць, паліваюць мала. Іх сакавітае лісце і сцёблы змяшчаюць многа вады. Усе расліны, якія любяць святло, тыпу алоэ, агавы, вядома, трэба таксама ставіць на падваконні.

Ценевынослівыя расліны, такія, як манстэра, папаратнікі, могуць правесці зіму і ў глыбіні памяшканняў. Паліваць іх трэба не часцей чым адзін раз у тыдзень. Рэдка паліваюць цыбульныя і клубнецыбульныя расліны, якія знаходзяцца ў стане спакою.

## У студзені ў садзе-агародзе

**У маласнежную зіму неабходна накідваць снег, галінкі, лапнік на градкі з падзімнімі пасевамі, каб яны не вымерзлі.**

У студзені можна пачынаць рыхтаваць глебу для вырошчвання расады. Калі не падрыхтавалі з восені, набывайце ў магазінах гатовыя сумесі. Усю набытую сумесь змочваюць гарачай вадой, рыхляць, старанна перамешваюць, насыпаюць на бляху слоем 5 см і ставяць у духоўку на 25—30 хвілін пры высокай тэмпературы (глеба павінна быць вільготнай). Затым глебу складваюць у мяшэчак з тканіны і выносяць на 6—10 дзён на балкон для прамарожвання — гэта добрая дэзінфекцыя. У час адліг і ў сонечныя дні прытоптваюць снег на градках, шчыльны снег будзе раставаць марудней, а значыць, градкам дастанецца больш вільгаці.

У студзені яшчэ больш, чым у снежні, недаступная ежа для зайцоў і мышэй. Яны могуць пашкодзіць сад. Таму трэба часцей правяраць абвязку дрэў, а ў дні з адлігамі прытоптваць снег на прыствольных кругах, праз шчыльны снег мыш не можа падысці да штамба дрэва. У вас у садзе прыкапаны саджанцы для веснавой пасадкі, загарадзіце шлях мышам унутр прыкопачнага ўчастка.

У студзені дрэвы стаяць аголеныя, кожная галінка добра праглядваецца, на ёй добра бачны згорнутыя, засохлыя лісцікі, абвітыя павуцінай — гэта зімовыя гнёзды баярышніцы, златагузкі і іншых шкоднікаў. З надыходам веснавога цяпла, яны ажывуць і пачнуць сваю разбуральную дзейнасць. У гэтыя дні, калі на дрэвах няма інею, гнёзды шкоднікаў трэба сабраць і спаліць. Адначасова трэба зняць мінулагоднія засохлыя плады, якія засталіся на галінках.

У студзені паклапаціцеся пра птушак: пабудуйце у садзе кармушкі для насякомаедных птушак і сістэматычна падкормлівайце іх. Пачысціце і адрамантуйце старыя і зрабіце новыя шпакоўні і птушыныя домікі.

## Дачніку на заметку

■ Садаводу-аматару трэба памятаць, што асноўная маса маладых каранёў пладовага дрэўца размяшчаецца прыкладна на такой жа адлегласці ад ствала, што і галінкі. Таму мала карысці для расліны сыпаць і ліць угнаенне каля самага штамба дрэва і далёка за межамі праекцыі кроны.

■ Бульба пры захоўванні даўжэй не прарастае, менш траціць вільгаці і не паражаецца гнілямі, калі ляжыць пры пастаяннай тэмпературы — 2—4 градусы. Але пры захоўванні клубні дыхаюць і паступова награваецца паветра. Таму, калі ў склепе тэмпература перавышае 6 градусаў цяпла, рэкамендуецца адкрываць люк (нават у моцны мароз), ахалоджваць памяшканне да 0 градусаў і затым шчыльна яго закрываць.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

<u>НАШ АДРАС</u>: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».**
**Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.**
**Тыраж 35.018. Індэкс 63850. Зак. № 409. Нумар падпісаны ў 19.30.**
**М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**
**П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**